# Выступленне Я. Я. САКАЛОВА

Паважаныя таварышы дэпутаты!

Думаю, вы згодзіцеся са мной, што размова на цяперашняй сесіі ідзе і вострая, і канструктыўная, і вельмі зацікаўленая. Інакш і не магло быць. Абмяркоўваюцца пытанні, якія маюць не проста важнае, а жыццёва важнае значэнне для ўсіх слаёў народа Савецкай Беларусі.

Вядома, не абыходзіцца і без залішне эмацыянальных усплёскаў, больш таго, і без неасэнсаваных заяў. Відаць, гэта можна растлумачыць і тым, што сёй-той пакуль што толькі авалодвае палітычнай культурай наогул і культурай палемікі ў прыватнасці.

Напярэдадні сесіі члены Бюро ЦК КПБ, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, урада рэспублікі пабывалі ў многіх працоўных калектывах з мэтай больш глыбокага і дэталёвага вывучэння грамадскай думкі, вызначэння шляхоў вырашэння ўзнікшых праблем. Вярнуліся мы і да дакументаў XIX партканферэнцыі і I З'езда народных дэпутатаў СССР, Пленумаў ЦК КПСС і пленумаў ЦК Кампартыі Беларусі. Гэта дапамагло падрыхтаваць, на мой погляд, грунтоўны даклад, з якім выступіў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі Мікалай Іванавіч Дземянцей.

Што, на маю думку, было найбольш характэрным пры абмеркаванні даклада?

Я адказаў бы на гэта пытанне так: заклапочанасць, разважэнні, пошук. Іменна заклапочанасцю лёсам Айчыны наогул і рэспублікі ў прыватнасці, разважаннямі аб тым, якім шляхам ісці далей, як памнажаць сацыялістычныя каштоўнасці, прасякнуты выступленні таварышаў Машко, Радзецкага, Гілевіча, Піскарова, Чыгрынава, Азгура, Саўчанкі, Старавойтава, Буланіцкага і многіх іншых дэпутатаў.

І гэта вельмі прыемна. Тое, што мы сёння робім, будзе вызначаць, якой стане наша рэспубліка, як, у якіх умовах будзе жыць яе народ у бліжэйшай будучыні і ў аддаленай перспектыве.

Разам з тым шукаць новыя падыходы, новыя формы і тым больш асвойваць іх прыходзіцца ў сітуацыі, калі накапілася мноства праблем, і ні ад адной — падкрэсліваю, ні ад адной з іх — нельга ўхіліцца.

Рэзультатыўнага вырашэння патрабуюць усе яны, але перш за ўсё — тыя, што звязаны з паляпшэннем жыццезабеспячэння чалавека, ростам народнага дабрабыту.

А дасягнуць гэтага можна толькі пры адной умове — калі мы будзем бачыць у перабудове, у абнаўленні сацыялізму натуральны працэс сацыялістычнай творчасці мас, рэалізацыі стваральнага патэнцыялу народа.

Гэта ленінскі падыход, і мы не адступім ад яго, як бы ні хацелі гэтага тыя, хто спрабуе павярнуць грамадства са шляху, на які наш народ стаў у кастрычніку семнаццатага года.

Не ведаю, як вам, але мой слых неяк разанулі легкаважныя адносіны да паняцця «народ». Каб рабіць заявы ад імя народа, трэба па меншай меры ведаць яго думкі, яго інтарэсы, яго патрэбы.

А што нярэдка бывае ў нас? Як з рога дастатку сыплюцца ў іншага прамоўцы лічбы, працэнты, факты, пасля якіх і гучыць вывад: такая, маўляў, думка народа, такое патрабаванне народа. Дазвольце спытаць: а ці сустракаўся прамоўца з народам, ці абмяркоўваў з ім гэтыя праблемы? Не, не сустракаўся і не абмяркоўваў.

Імкненне што б там ні было выдаваць сябе за прадстаўніка народа выглядае часам і смешна, і фальшыва.

Нядаўна ў Мінску невялікая група маладых людзей збірала на вуліцы подпісы на лістках паперы, адзін з якіх меў такі загаловак: патрабаванне рабочага класа да кіраўніцтва рэспублікі па неадкладнаму і поўнаму забеспячэнню насельніцтва таварамі народнага спажывання, па зніжэнню цэн на іх.

Асобныя прахожыя распісваліся на гэтых лістах, не ведаючы, на якія мэты ў выніку іх подпісы будуць выкарыстаны.

Скажыце, калі ласка: хіба можна лічыць такі збор подпісаў патрабаваннем народа? Гэта не што іншае, як падман народа. Падман з боку тых, хто ўсяляк паклёпнічае на Савецкую ўладу, узводзіць паклёп на партыю, на сацыялізм, шукае шляхі канфрантацыі з грамадствам, парушэння нармальнага рытму работы народнай гаспадаркі.

Многія з вас ведаюць аб учарашнім мітынгу. Пачаўся ён у рабочы час. Быў парушаны аўтобусны і тралейбусны рух. Рабочыя, служачыя не змаглі своечасова забраць дзяцей з дзіцячага сада, вярнуцца дамоў, нармальна адпачыць. А тыя, каму ў другую змену, не змаглі прыйсці да пачатку работы. Толькі камунальнай гаспадарцы горада, паводле папярэдніх даных, нанесены страты ў суме 125 тысяч рублёў.

І што асабліва трывожыць? У мітынгах удзельнічае многа падлеткаў—навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў. Нямала і п'яных. А красамоўнічаюць перад імі асобныя народныя дэпутаты СССР і дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Як разумець іх? Няўжо яны і сапраўды думаюць, што гэта і ёсць перабудова?

Я звяртаюся да тых, хто лічыць, што яму ўсё дазволена, хто мяркуе, што законы пісаны не для яго. Яны глыбока памыляюцца. Грамадства сёння патрабуе захавання законнасці, узмацнення правапарадку, умацавання дысцыпліны. І да гэтых патрабаванняў не можа, не мае права не прыслухацца кожны з нас.

Нам зразумелы крытычныя адносіны да абвастрэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі. Але мы рашуча супраць таго, каб гэтым спекулявалі ад імя народа тыя, хто на справе палец аб палец не ўдарыць, каб хутчэй вырашыць накопленыя праблемы.

Тыя ж тавары народнага спажывання. Яны вырабляюцца не

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы